# Lemantar histaryčnaj śviadomaści

# Лемантар гістарычнай сьвядомасьці

## Асабістая спадчына кожнага

Веданьне гісторыі свайго Краю — сучасны трэнд і норма жыцьця. Знакавыя гістарычныя падзеі адзначаюцца, як дзяржаўныя сьвята.  Імёны выбітных сыноў Края надаюцца вуліцам і ўстановам. Але не ў РБ.

Каб выправіць недарэчнае становішча, складзены гэты лемантар — дзеля беларусаў, літвінаў, тутэйшых (незалежна ад узросту).

Скарочаны выклад гісторыі нашага Краю.

---

Энцыклапедыя Літвы-Беларусі

2018

# Прадмова

Гэты лемантар — спроба выкласьці доўгі шлях нашага Краю ў тым выглядзе, у якім гісторыю звычайна ўсьведамляе звычайны чалавек. У выглядзе лягічнага ланцужка ключавых асоб і падзей. Гэты ланцуг гістарычнай сьвядомасьці есьць *нацыянальны міт* (афіцыйны тэрмін) — існуючы і асобны ў кожнай краіне. І наш нацыянальны міт есьць яскравы і захапляльны.

Ён, як заўжды, крыху спрошчаны. Але ў яго падмурках ляжаць трывалыя крыніцы — ад летапісаў да акадэмічных прац. "Chronicon terrae Prussiae" 1326 Peter von Duisburg, “Спіс войска Літоўскага” 1528, лісты Міндаўга, Гедыміна і Вітаўта, Метрыкі Літоўскія, акадэмічныя выданьні Імператарскага Геаграфічнага Таварыства і шмат інш.*

Ён, як паўсюль, не вельмі лагідны да суседзяў. І гэта нармалёва. Іхнім мітам таксама не ўласьцва лагіднасьць — “польскія крэсы” да Смаленска, “выправы аукштайтаў” да Кіева, “заходняя Расея” да Падляшша. Толькі з Украінай спрэчка мітаў лакалізавалася на натуральнай мяжы — Палесьсі, рэшткам мора Герадота.

Той, хто ўспрымае Краёвы нацыянальны міт — есьць частка краёвай нацыі. Нацыі беларускамоўных літвінаў, рускамоўных беларусаў, тутэйшых. Тых, хто кажа *“Я нарадзіўся тут, тут мае карані”* і лічыць сабе нашчадкам спадчыны.

Той, хто карыстаецца мітамі суседзяў — трапляе ў “ушчамлённае русско-польско-язычное население”. І іншага выбару не існуе.

---

* З першакрыніцамі ў арыгінале і перкладзе, са шматлікімі матэрыяламі па гісторыі нашага Краю можна падрабязьней азнаёміцца на старонках

Краткая гісторыя Беларусі за апошняю 1000 год http://history-belarus.by/

Энцыклапедыя Літвы Беларусі https://www.facebook.com/litva.belarus/

Гісторыя Беларусі на ОК https://ok.ru/group/53595131412721

# Рода-племянныя хаўрусы V-VIII ст.




Напярэдадні складаньня першых дзяржаўных стварэньняў на нашых землях існавалі рода-племянныя хаўрусы, па рознаму ўзгаданыя ў летапісах — ад сарматаў ды вянедаў да яцвягаў і крывічаў. Усе яны не *былі*, а *сталі* “славянамі”, склаўшы адзіны этнас у межах адзінай дзяржавы к XIV-XV ст.

Той час большую частку нашага Краю археолагі пазначаюць як *культуру штрыхаванай керамікі* (III-V ст.) і *банцераўскую альбо тушэмлінскую культуру* (IV-VII ст., назва ад вёскі Банцараўшчына пад Менскам).

Некалькі цытат ад В.В. Седова (1924-2004) — археолага, загадчыка аддзела палявых дасьледваньняў РАН, чальца-карэспандэнта РАН, акадэміка АН Латвіі.

*"Вычленить в составе населения банцеровской культуры местный балтский и пришлый славянский этнические компоненты не представляется возможным. По всей вероятности, в ареале этой культуры сформировался славяно-балтский симбиоз. Можно полагать, что время банцеровской культуры было начальным этапом славянизации местного населения…*

*Важнейшие этнографические признаки славянских культур V-VII вв.— лепная керамика, погребальный обряд и домостроительство... Жизнь на городищах раннего железного века полностью затухает, все население теперь концентрируется на открытых поселениях, возникают убежища с мощными фортификационными сооружениями…”*

Такім чынам "славянства" — гэта не радавое паходжаньне ці памер чарапоў, а пераход з зямлянкі ў падабенства гарадоў і развітыя рамёствы. Верагодна, да IX-X ст. — пачатку фармаваньня Полацкага княства на "шляху з варагаў у грэкі", — склалася агульная мова-*койнэ* (агульназразумелая мова стасункаў).

У выніку меж-плямённых стасункаў і далейшага з’яднаньня ў межах агульнай дзяржавы (В. княства Літоўскага) склаўся адзіны *валдайска-верхнедзвінскі антрапалагічны комплекс,* амаль дакладна супадаючы з мапай расьсельніцтва “беларускага племені” М. Доўнар-Запольскага (1919) .




В. В. Бунак,
«Происхождение и этническая история русского народа по антропологическим данным»
М.: Наука, 1965, стр. 244

# Полацкае княства IX-XIII ст.




Полацкае княства — княства крывічаў на "Шляху з варагаў у грэкі"дамінаваўшае ў рэгіене ў IX - XIII ст.  Ад Кіеўскага княства было адмежавана морам Герадота (цяпер Палесьсе), ад Польшчы — дзікімі ятвяскімі землямі. Напрыкацы XIII ст., за часам князеў Віценя, Воіна і Гедыміна, было мірна далучана да Вялікага княства Літоўскага.

Упершыню ўзгадваецца ў скандынаўскай хроніцы "Дзеі данаў" (Gesta Danorum), што распавядае аб паходзе на Полацк легендарнага караля Фрода І (V-VI ст. н.э.). У "летапісах рускіх" упершыню ўзгадваецца ў 862 г. ( "Аповесьць мінулых гадоў").

Полацкія летапісы зніклі са знішчэньнем Сафійскага сабора маскоўскім войскам і многія ўспаміны аб княстве захаваліся толькі ў скандынаўскіх хроніках. Так Сафія, князёўна Менская, што рускімі летапісамі не згадваецца ўвогле, была каралевай Дацкай, жонкай Вальдэмара І Вялікага.

Усходняя мяжа Полацкага княства — найстарэйшая дзяржаўная мяжа сучаснай Беларусі. На гэтай мяжы адбылося звыш 80% усіх войнаў у нашаей гісторыі.

**Рагвалод, Рагнеда, Ізяслаў. Рагваложы ўнукі.**

Першым вядомым князем Полацка быў Рагвалод († 978). Да гэтага часу застаецца амаль містычнай фігурай — звестак пра яго і ягонае паходжаньне мала: *"прыйшоў з-за мора і трымаў уладу сваю ў Полацку".*

Прамых нашчадкаў па мужчынскай лініі Рагвалод не пакінуў — кіеўскі князь Уладзімір (хрысціцель Русі) забіў яго і ягоных сыноў, і гвалтам узяў у жонкі дачку Рагнеду.

Рагнеда спрабавала адпомсціць і забіць Уладзіміра, але спроба была няўдалай. На яе абарону з мячом паўстаў старэйшы сын — малалетні Ізяслаў. Па радзе баяраў: *"Не забівай яе дзеля дзіцяці гэтага, але аддай бацькоўскую вотчыну ёй з сынам тваім",* Ізяслаў і Рагнеда былі адпраўленыя ў Полацкую зямлю, горад Заслаўе.

*"І з таго часу спаганяюць меч Рагваложы ўнукі супраць Яраславічаў."*

Дзеці ад шлюбу Уладзіміра і Рагнеды паклалі пачатак родам Ізяславічаў-Рагвалодавічаў ("Рагваложы ўнукі" — князі Полацкія) ад старэйшага сына Ізяслава і Яраславічаў ("Рурыкавічы" — князі Кіеўскія, Наўгародскія, Растоўскія) ад Яраслава Мудрага, малодшага сына.

*"У векавой звадзе Яраславічаў і Ізяславічаў ёсць нешта расавае"* — адзначаў прафэсар Пецярбургскага універсітэту  А. Н. Весялоўскі. З адзінаццаці “З’ездаў князёў рускіх” Полацкі князь прысутнічаў толькі на адным — калі пасьля бітвы на Нямізе (1067) Усеслаў-Чарадзей быў запрошаны на перамовы да супраціўнікаў.





Заславль

**Росквіт і заняпад**

Свайго росквіту Полацкае княства дасягнула ў XI стагодьдзі, цягам якога стагодьдзя ўладарылі два князі: Брачіслаў (1003-1044), сын Ізяслава і заснавальнік Браслава, і Усеслаў-Чарадзей (1044-1101), сын Брачыслава. Княства кантралявала буйны гандлевы шлях Заходняй Дзвіны і было найбольш уплыўным ваяўніча-культурным центрам рэгіёну.

За часам праўленьня Уселава адбылася буйнешая бітва тых часоў — бітва на Нямізе 1067 года. Полацкае войска білася з аб’яднанымі сіламі Яраславічаў — кіеўскага, чарнігаўскага і пераяслаўскага князёў.

Па выніку бітвы Яраславічы збеглі за межы княства і запрасілі  Усеслава на перамовы. Калі Полацкі князь  прыбыў на сустрэчу пад Оршай, то быў зняволены і адвезены ў Кіеў.  Хуткае паўстаньне гараджан узнесла яго на кіеўскі княскі пасад, ад якога ен адмовіўся і вазвярнуўся ў Полацк.

Княская пячатка Усеслава, што прысутнічае нават на яго знакамітай выяве ад Яэпа Драздовіча, верагодней за ўсе, стала прататыпам Калюмнаў — сымбаля Гедымінавічаў.



кн. Владимир
†1015



кн. Изяслав
†1001



кн. Всеслав
†1101



Калюмны
кн. Витень (†1316)

Пачатак XII ст. Па тэстамэнту Усеслава княства было падзелена паміж сямерых ягоных сыноў. Пачалося стагодьдзе феадальнай раздробненасьці. Працягвалася варожасць з Яраславічамі — у разгарэлай вайне полацкія князі быў узяты ў палон і высланы ў Візантыю.  Праз 10 год яны вазвярнуліся, але ўладу ўжо абірала веча.

Напрыканцы XII стагодьдзя форму кіраваньня ў Полацкім княстве "Хроніка Літоўская і Жмойтская" характарызуе так:

 — *"свабоднасць полацкая або Венецыя …в той час волно собе пановали и жадной зверхности над собой не мели, с посродку речи посполитой своей на поточные справы судей и сенаторов прекладали".*

**Турава-Пінскае княства**

На Палесьсі, па сярэдняй і ніжняй плыні Прыпяці, на поўдні нашага Краю ў X-XIV стагодьдзях існавала Тураўскае княства. *“Рагвалод жа прыйшоў быў з-за мора і меў уладу сваю ў Полацку. А Тур (сеў) у Тураве, ад яго ж і тураўцы празваныя”.*

Адасобленае багнамі-рэшткамі мора Герадота, яно нейкі час было падпарадкавана Кіеву, нейкі час было незалежным. Да агульный дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага, — было далучана Гедымінам у XIV ст.

**Рэлігія часоў Полацкага княства**

Хрысціянства прыйшло на Полацкую зямлю раней, чым Царква размежавалася на Рыскую і Візантыйскую (раскол царквы ад 1054 г.) .

Яго у 986 годзе прынес Торвальд Кодрансан († 1002) — ісляндскі вараг, узгаданы ў шматлікіх сагах. Ен заснаваў ў Полацку манастыр і царкву св. Іаана Хрысціцеля, быў пахаваны побач з Полацкам на беразе Дзвіны і ўшаноўваўся як сьвяты.

Але агульнае прыняцьце хрысціянства расцягнулася на стагодьдзі. Полацкі Сафійскі сабор адбудавалі князі Брачыслаў і Усеслаў. Але яны, у адрозьняньне ад будаўнікоў св. Сафіі ў Кіеве і Ноўгарадзе, не былі далучаны да ліку святых. Адзін з іх быў *народжаны валхавньнем,* а другі лічыўся *калдуном-ваўкалакам*.




Нават, першым Полацкім князем, меўшы хроснае імя, стаў толькі сын Усеслава-Чарадзея — Рагвалод-Барыс (1040-1128), што *“хадзіў на яцвяг і па вяртаньні паставіў горад ва імя свае [Барысаў]”.* Ен жа напрыканцы XII ст. правёў хрышчэньне паганскіх капішч — Дзвінскіх камянёў (10 хрышчоных камянёў з вядомых на сеньня 75 культавых валуноў па ўсёй Беларусі) .

Напрыканцы XII ст. у нашым Краі было толькі тры хрысціянскіх святых — Торвальд Кодрансан († 1002), Ефрасінія Полацкая († 1167) і Кірыла Тураўскі († 1182). Тым часам на Кіева-Наўгародзкіх землях да ліку святых было далучана толькі князёў больш за 30 чалавек, не ўлічваючы простых мніхаў і святароў.

Такім чынам, калі ў Полацкім і Турава-Пінскім краях хрысціянства ўжо пусціла свае карані, на астатняй тэрыторыі пераважна панавалі паганскія вераваньні. І не існавала звады паміж Візантыйскай і Рымскай царквой — шлюбу Менскай княжны і Дацкага караля ў 1157 годзе анічога не замінала.




Традиционный беларуский крест «Русский крест»

Нават значна пазьней, у пачатку XIV ст, нямецкія і польскія летапісы, узгадваючы Давыда Гарадзенскага, ваяводу Гедыміна, — у апісаньнях ваяўнічых выправаў каштэляна Гародні з войскам літвінаў, — пазначалі яго як *“ворага веры хрысціянскай, які замест таго, каб прыняць хрышчэньне, святыні і цэрквы руйнаваў і рабаваў”.*

І гэта пры станоўчым стаўленьні самога Гедыміна да хрысьціянства — пабудаваўшы першыя свае храмы ў Наўгародку і Вільне, ён неаднойчы запрошваў да сабе францысканскіх і дамініканскіх сьвятароў.

Такі стракаты пазл.

# Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ)

Княства, існаваўшае з XIII ст. па 1795 год. Упершыню з’яднала беларускія землі ў адзіную дзяржаву. У ягоных межах да XV ст. склаўся адзіны беларускі этнас. Дзяржаўнай мовай да 1696 года была старабеларуская, на якой пісалі свае лісты Вітаўт і Баторый, выкладаліся Метрыкі Літоўскія і Статуты.

«Великое княжество Литовское, Руское и Жомойтское» (згодна Статута 1529 г.)




1— Lithuania-Литва , 2 — Земли Руские, 3 — Samogitia-Жомойть (современн.Жемайтия и Аукштайтия)

# Ад заснаваньня да Крэўскай уніі 1385 г.

**Палітычны стан XIII ст.**

Ад пачатку XIII ст. балтыйскае ўзбярэжжа пачынае кантраляваць Лівонскі Ордэн. У XIII ст. Ордэн закладае горад Рыгу (1201) на Заходняй Дзвіне і Мемель (1252) на Немане, канчаткова замацаваўшы свой кантроль над гандлевым шляхам.

Заснаваны дзеля Крыжовых паходаў у Палесціну, Тэўтонскі Ордэн стаў моцнай сілай у Прускім Крыжовым паходзе (1223), заняўшы Прусію ды вусьца Немана. Імкнуўся тэрытарыяльна злучыцца з Лівонскім Ордэнам (Латвія) праз Самагітыю, дзе на той час існавала прымітыўнае грамадзтва без гародоў і рамёстваў.

На паўднёвыя і ўсходнія княствы йдзе Татара-мангольская навала. Да 1240 года Арда захапіла і зруйнавала Кіеў, Маскву, дайшла да Смаленска.

**Літва Міндаўга 1236-1269**

Упершыню Міндаўг узгадваецца у Валынскай дамове 1219 года разам з іншымі *кнзямі літоўскімі* — Жывінбуд, Велікаіл, Булевічы, Рушкевічы.

Найбольш лягічна раптоўнае ўзьнікненьне моцнай ваяўнічай дзяржавы сярод абасобленых і неўплывовых крывічска-валынскіх анклаваў (Гародня, Слонім, Наўгародак, Ваўкавыск) на дзікіх ятвяскіх землях дае *Monumenta Poloniae Historica* XII ст.

*“Хрышчоныя прусы са сваім каралем Мендальфам за шматлікіх цяжкасьцей, учыненых ім крыжакамі, пакінуўшы Хрысціянская веру, што прынялі раней, сышлі з некаторымі братамі Ордэна да літвінаў (Litwanos), смела да іх далучыўшыся”*

У перыяд кіравання першых князёў (Міндоўг, Войшалк, Шварн і інш) — да канца XIII ст. — Літва пашыралася на поўнач, у бок "нічыйнай" Жмудзі-Самагітыі,

У 1253 па даручэньню Папы Інакенція IV князь Міндаўг стаў адзіным *каралем Літвы* і быў каранаваны ў Навагародку. За дапамогу з каранацыяй ен перадаў Тэўтонскаму Ордэну сваю частку Самагітыі, якую потым спрабаваў захапіць ізноў.

Той жа Папа ў наступным годзе каранаваў адзінага *караля Русі* — Данііла Галіцкага, уладара Галіцка-Валынскага княства. Сын Данііла, Шварн, абраны шлюбам з дачкой *караля Літвы*,  быў наступным в. кн. Літоўскім, пасьля Міндаўга і ягона сына Войшалка.



За 27 год праўленьня Міндаўга (1236-1263) былі замацаваны — пісьмовыя стасункі з Эуропай, станоўчыя адносіны да хрысціанства (Міндаўг хрысціўся двойчы — па Візантыйскаму і Рымскаму абрадам), эўрапейскі каралеўскі тытул. Значна пашырыліся пачатковыя межы княства.

Пасля сьмерці Міндаўга і ягонага сына Войшалка, улада ад Шварна перайшла да нальшанскіх і жамойцкіх князеў — Тройдзень, Букідыд (?), Пукувер (?), інш. (?).

За 25 год іхняга кірваньня (1270-1295) было страчана — пісьмовыя стасункі, дачыненьне да хрысціянства, каралеўскі тытул. Межы княства не пашыраліся.

*Гэта цікава. Насуперак распаўсюджанаму меркаваньню, памежжа Беларусі і Летувы — ад Даўгаўпілса да Сувалак, з канчаткамі тапонімаў на *-ішкі,*— не было “першапачатковай Літвой”. Гэта былі васальныя Літве княствы Нальшаны і Дяволтва. Да ўласна Літвы іх далучыў толькі Войшалк пасьля смерці Міндаўга.




**Віцень, Воін і Гедымін 1293-1341**

*Anarchie* або *sans duc.* (*анархія, без князя*) — так пазначалі старыя падручнікі перыяд ад 1223 года ў Полацкім княстве і ад 1267 (пасля Шварна) у княстве Літоўскім.

Канец гэтага перыяду звязвалі з княжаннем братоў (?) — князя Воіна ў Полацку (1307)  і князя Віценя ў Літве (1295).

Менавіта з Віценем летапісы зьвязваюць прыняцьце сымбаляў Пагоні і Калюмны. *«Витен нача княжити над Литвою, измысли себе герб и всему князству Литовскому: рыцер збройны на коне з мечем, еже ныне наричут Погоня… Ужывал знак рыцерски трех слупов на поле червоным белых".*




Гедымін, які быў (?) трэцім братам Віценя і Воіна, прыняў княскі пасад пасьля Віценя і аб'яднаў абодва княства. Ен перанес сталіцу з Наўгародку ў Вільню (1323), якую пабудаваў на старым крыўскім паселішчы Крывы Замак (Curvum Castrum).

Гедымін княжыў 25 год (1316-1341). Ён аднавіў пісьмовыя стасункі з Эўропай і station станоўчае стаўленьне да хрысьціянства — запрошваў францысканскіх мніхаў у свае першыя два храма, пабудаваныя ў Вільне і Наўгародку.

Паходжаньне Гедыміна з братамі невядома, але найбольш лягічнай выглядае версія іх паходжаньня з Рагвалодавічаў — яны падоўжвалі культурныя традыцыі Полацка і *мірным шляхам* з’ядналі Полацкае і Літоўскае княствы. Гэтая версія была агульнапрыняітай у выданьнях *Императорского Русского Географического Общества.*

Паходжаньне Гедымінавічаў з Самагітыі (Жамайтыі ці Аукштайтыі) выглядае зусім малаверагодным — на той час там не існавала ні гарадоў, ні пісьмовасьці, ні раместваў, ані стасункаў са знешнім сьветам. Не вядома было нават калясо, цэгла і ганчарны круг. Зусім іншы ўзровень культуры і мірапоглядаў.

За часам Віценя і Гедыміна ўпершыню ў *адзіную дзяржаву* — Вялікае княства Літоўскае, — былі злучаны ўсе беларускія землі, акрамя Мсціслаўя за Дняпром. У межах ВКЛ цягам наступнага стагодьдзя ўтворыца *адзіны беларускі этнас*. І да самага пачатку XIX ст. ни адзін захопнік не здолее падпарадкаваць гэтую зямлю і гэты народ.

У сваім тэстамэнце Гедымін, як і ў свой час Усеслаў-Чарадзей, падзяліў свае княства паміж сямёх сваіх сыноў.

**Альгерд и Кейстут 1345-1377**

Княства Літоўскае магло здрабіцца, нібы Полацкае ў свой час. Так, Альгерд стаў князем Віцебскім, а Кейстут атрымаў заходнюю частку княства — ад Самагітыі і Трокаў да Берасьця.

Але ўжо да 1345 года Альгерд з дапамогай Кейстута заняў пасаду Вялікага князя Літоўскага. З тых часоў да самай сьмерці Альгерда браты дзейнічалі салідарна і дастаткова самастойна.

З імём Кейстута звязана першая згадка аб вусным выкарстаньні беларускай мовы. Пры дамове аб згодзе з вугорскім каралем, ен забіў быка (рагатую жывелу, рагаціну) і ўсклікнуў: *“Рагаціна — розні нашы. Госпад з намі.”* І тую клятву дасканала запісаў лацінскімі літарамі пісар Дубніцкай хронікі.

За часам княжэньня Альгерда— 32 гады (1345-1377), — тэрыторя краіны падвоілася. Ен разбіў войска Залатой Арды ў бітве на Сініх Водах (1362) і далучыў да ВКЛ Валынь, Кіеў і Падольле.




XIII-XV вв. Границы ВКЛ в правление князей

- Миндовг (к 1263)
- Витень (1293-1316) и Гедымин (1316-1341)
- Ольгерд (1345-1377)
- Витовт (1392-1430)
- Верховские княжества, периодически подчинявшиеся ВКЛ
- Границы к 1465 г.

Альгерд тройчы знішчаў маскоўскае войска і двойчы асаждаў Маскву. *“Абы Москва памятала, как копие свое Ольгерд крушил о браму московскую”* (с) Хроніка Літоўская і Жамойцкая.

Пры Альгердзе ўсе беларускія землі былі злучаны ў адзіную дзяржаву, што існавала да пачатку XIX ст. Па тэстамэнце новым вялікім князем Літоўскім стаў сын Альгерда ад Тверской князёўны Юліаны, Ягайла.

**Ягайла і Вітаўт 1377-1430. Крэўская унія 1385**

Ягайла (1362 - 1434) — князь віцебскі, в. князь Літоўскі (1377-81, 1382-92), радавы маентак Крэва. Кароль Польскі (1386-1434) пад імём Уладзіслаў II Ягайла.

Вітаўт (1350 - 1430)— сын Кейстута і стрыечны брат Ягайлы. Князь гарадзенскі (1370-82), луцкі (1387-89), троцкі (1382-13). В. князь Літоўскі (1392-1430). Абвешчаны кароль гусітаў (Чэхія). Адзін з найбольш вядомых кіраўнікоў Вялікага княства Літоўскага, ужо пры жыцьці празваны Вялікім.

Цягам княжэньня Ягалы і Вітаўта— 1377-1430 гады, — ВКЛ дасягнула свайго росквіту і дынастычна з’ядналася з Польшчай.

Адбылося шмат знакавых падзей. Прайшла Грамадзянская вайна, цягам якой абодва князі наперамену зьвярталіся да Тэўтонскага Ордэну за дапамогай, прапануя наўзамен Самагітыю. Заключана Крэуская унія з Польшчай. Праведзена каталіцкае Хрышчэньне Літвы. У выніку Вялікай вайны з Тэўтонскім Ордэнам, праз перамогу пад Грунвальдам, да ВКЛ канчаткова далучана Самагітыя.



Храналёгія падзей.

1377 Пасьля сьмерці ст. кн. Альгерда новым вялікім князем становіцца Ягайла. Паколькі ён не быў ні малодшым братам, ні старэйшым сынам памерлага князя, парушэньне дынастычнагй спадкаемкасьці выклікала барацьбу за ўладу ў ВКЛ.

1381-84 Першы этап Грамадзянскай вайны за ўладу ў ВКЛ — Ягайла vs Вітаўт і Кейстут. Кейстут, ненадоўга які ўзяў уладу (1381-82), гіне ў палоне ў Крэўскім замку. Ягайла застаецца в. князем Літоўскім.

**Крэўская унія 1385** — пагадненьне аб дынастычным хаўрусе ВКЛ і Польшчы праз шлюб в. кн. Ягайла з каралевай Ядвігай. Такім чынам, Ягайла, застаючыся князем Літоўскім, становіцца каралём Польшчы.

1386 Ягайла  абіраецца шлюбам з трынаццацігадовай каралевай Ядвігай. Усяго меў чатыры жонкі. Шлюб з апошняй — Сафіяй Гальшанскай-Друцкай, — паклаў пачатак эўрапейскай дынастыі Ягелонаў.

1387 Ягайла вяртаецца ў Вільню і, сумесна з Вітаўтам, праводзіць актыўнае *Хрышчэньне Літвы* ў каталіцкую веру.



1389-92 Другі этап Грамадзянскай вайны — Ягайла vs Вітаўт. Вітаўт імкнецца стаць незалежным ад Кароны ўладаром ВКЛ.

1392 Востраўскае пагадненне — вынік Грамадзянскай вайны. Вітаўт прызнаны Вялікім князем Літоўскім і прыносіць прысягу на вернасьць каралю Ягайлу.

1398 Вітаўт прымае да сябе хана Тахтамыша — нашчадка Чынгісхана, пацярпеўшага паразу ў барацьбе за ўладу ў Ардзе, — і расьсяляе ў ВКЛ ягонае войска. Цягам часу нашчадкі татар ўспрынялі літвінскія імёны (Абаровічы, Шабановічы, …) і пакінулі цікавыя помнікі мовы-пісьменства, *кітабы* — запісы арабскімі літарамі беларускай мовы.

1399 Бітва на Ворскле — параза войска Вітаўта і Тахтамыша ад Залатой Арды. Канец экспансіі ВКЛ на паўднёвы ўсход.

1410 Бітва пад Грунвальдам — перамога над Тэўтонскім Ордэнам. Самагітыя (сучасныя Жэмайтыя і Аукштайтыя) канчаткова далучаны да ВКЛ.



Великая война 1409-1411 и битва под Грюнвальдом (15 июля 1410). Присоединение Самогитии к ВКЛ

1413 Гарадзельская унія — уведзены спадчынны інстытут вялікага князя Літоўскага і пакладзены пачатак сучаснай *беларускай геральдыцы* праз далучэньне баярскіх радоў да шляхецкага гербавага братэрства Польшчы.

Вітаўт княжыў амаль 40 год (1350 - 1430). Пры ім ВКЛ дасягнула піка свайго тэрытарыяльнага развіцьця. У нацыянальным эпасе "Песня пра зубра" 1523 года ён паўстае легендарным князем "залатога стагодьдзя", узорам кіраўніка.

# ВКЛ ад Крэўскай да Люблінскай уніі 1569

Час праўленьня Вітаўта паклаў пачатак “залатому стагодьдзю ВКЛ”.  Але унія з Польшчай надала свой адбітак далейшаму шляху гісторыі. Акрамя моцнага дынастычнага хаўрусніка на захадзе, княства атрымала пэўныя унутраныя праблемы — Гарадзельская унія ўшчаміла ў правах вернікаў ўсходняга абраду. Пасьля сьмерці Вітаўта распачалася Грамадзянская вайна.

**Свідрыгайла і Грамадзянская вайна 1432-1438**

Свідрыгайла (1370-1452) — сын Альгерда, князь віцебскі, падольскі, ноўгарад-северскі, чарнігаўскі і бранскі, Вялікі князь Літоўскі (1430-32), князь валынскі (1434-52). Сын Альгерда і цвярской князёўны, малодшы брат Ягайлы і стрыечны брат Вітаўта.

1430 Пасьля сьмерці Вітаўта Літоўская шляхта і баяры абіраюць Свідрыгайла новым Вялікім князем. За гэтую пасаду ен — часасам дыпляматычна, а часам збройна, — змагаўся 40 год, зьвяртаючыся за дапамогай да Тэўтонскага Ордэну і Масквы.

Ён скасаваў хаўрус з Польшчай і адмовіўся прысягаць Ягайлы — *"Я не з яго ласкі, але з Божай і па праве прыроднага майго вялікі князь; маю цяпер час адпомсьціць яму за даўнія крыўды, няхай будзе ўдзячны, што я да гэтага пачытаю і паважаю яго наўпрост  як старэйшага брата і караля польскага."*

Каб павялічыць сваю папулярнасьць сярод вернікаў веры грэчаскай (“праваслаўных”), Свідрыгайла ўзроўніў іх у правах з каталікамі.

1432 Пры падтрымцы Польшчы яго зрынае стрыечны брат Жыгімонт (сын Кейстута), і краіна апускаецца ў бездань Грамадзянскай вайны. Падзел падтрымкі ваюючых бакоў можна правесьці згодна “Спісу гарадоў Свідрыгайла”, захаваўшамуся ў архівах Тэўтонскага Ордэну.

1434 Вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч выдае Вялікі земскі прывілей, што абвесьціў раўнапраўе каталікоў і праваслаўных.

Таксама ў гэты год памёр польскі кароль Ягайла. Новым каралем становіцца ягоны старэйшы сын, Уладзіслаў III.

1439 *У гэты год паміж Візантыйскай і Рымскай царквой была заключана Фларэнтыйская унія — пагадненьне аб з’яднаньні. Праз 157 гадоў у нашым Крае яна падоўжыцца Берасьцейскай царкоўнай уніяй 1569 г.

Вайна цягнулася яшчэ чатыры гады і завершылася паразай Свідрыгайла. Ён дажыў да 1452 г. і памёр ва ўзросце 82 год князем Валынскім. Жыгімонт, не маючы падтрымкі сярод літоўскіх баяр, быў забіты ў выніку змовы ў 1440 годзе.




**Гражданская война в ВКЛ 1432-1438**
— земли, поддержавшие Свидригайло (преимущественно "православные"), согласно списку *городов, замков и волостей* (civitatum, castrorum et districtuum), сохранившемуся в архивах Тевтонского Ордена.

Считается, что это приложение к договору Свидригайла с Тевтонским орденом 1432 г.



**Вялікія князі-Ягелоны 1440-1572**

1440 Пасьля забойства Жыгімонта Кейстутавіча, в. князем абраны малодшы сын Ягайла, брат караля Польшчы — Казімір.

1444 Кароль Польшчы Уладзіслаў III загінуў бітве з турэцкім султанам пад Варнай. Вялікі князь літоўскі Казімір становіцца новым каралём (Казімір IV Ягелончык).

І да 1572 года Польшчай і ВКЛ будзе кірваць дынастыя Ягелонаў. Таксама Ягелоны — нашчадкі Ягайла і князёўны Сафіі Гальшанскай-Друцкай, — уладарылі ў Чэхіі і Вугоршчыне.





**Войны 1487-1537, акрэсьліўшыя ўсходнюю мяжу РБ**

1430-1500 Межы ВКЛ пасля смерці Вітаўта (1430) і да распаду Залатой Арды заставаліся амаль нязменнымі. Аднак пасля смерці Ахмат-хана Вялікай Арды (1481), *"ханская стаўка была перанесена ў Крэмль "* і распачалася экспансія Маскоўскага княства

Маскоўскае княства, застаючыся даньнікам Крымскага хана (выплата даніны-“поминков” была спынена ў 1700 г. Канстанцінопальскім пагадненьем), стала пашырацца. Была зьнішчана Наўгародская Рэспубліка, захоплены Вяцкі зямлі і Тверскае княства. Тэрыторыя Маскоўскага княства павялічылася ў тры разы.

На нашаей усходняй мяжы адбыўся 50-гадовы шэраг войнаў, акрэсьліўшых сучасную мяжу Рэспулкі Беларусь.



**Бітва пад Оршай** 8 верасьня 1514— самая знакамітая бітва часоў гэтай навалы. Пасьля 27 год амаль бесперапыннай вайны і вялікіх страт, гэтая бітва спыніла навалу і ўсталявала мяжу, што трымалася 258 год. І аднавілася сеньня — сучасная мяжа праходзіць менавіта там, дзе была замацавана ў тыя часы.

Розніцу мірапоглядаў літвінаў і масквіцян адзначаў Гербершэйн у сваіх “Нататках аб Маскові” 1549 года:

*— "Усе яны (маскавіты) прызнаюць сябе халопамі (chlopos), гэта значыць рабамі, Васпана ... Гэты народ знаходзіць больш задавальненьня ў рабстве, чым у свабодзе. Бо перад смерцю спадары, у вялізнай большасці выпадкаў, адпускаюць вядомых рабоў на волю, але гэтыя апошнія адразу, за грошы, аддаюць сябе ў рабства іншым гаспадарам.*

*Кожны раз, як яны казалі з намі пра Літвінаў, яны насмешліва выказвалі, што калі іхні кароль ці вялікі князь загадае каму-небудзь ехаць у амбасаду ці іншае месца, то тыя адгаворваліся, што ў іх, маўляў, жонка хворая, ці не хапае коней. Гэтага ў нас не водзіцца, — казалі яны і прытым з усмешкай на вуснах, — едзь усюды па ўсіх загадах, калі ты хочаш захаваць галаву цэлай "*

**Спіс войска Літоўскага 1528**




Спіс войска Літоўскага — попіс шляхты, панцарных баяр і земян, павінных прымаць удзел у паспалітым рушэньні (ваеннай мабілізацыі *шляхты*, простыя сяляне мабілізацыі не падлягалі). Да нашых дзён дайшлі тры перапісу войска ВКЛ XVI стагодьдзя, у рознай ступені захаванасьці.

"Перапіс войска" дае добрае ўяўленьне аб яго нацыянальным складзе. Больш за 95% спісу — беларускія прозвішчы. *Малышэвіч, Глебовіч, Каспаровіч, …* Прозвішча (радавое імя) — традыцыйны прыкмета нацыянальнай ідэнтычнасьці. І сёньня кожны беларус можа знайсьці прозвішчы сваіх знаёмых і сваякоў сярод імён літвінаў, якія змагаліся і пamiралі за сваю зямлю . Нават у Самагітыі-Жмудзі шляхтай былі толькі *літвіны* з беларускімі прозвішчамі.

*“Каждый боярин, шляхтичъ особами менован естъ и на кольку конехъ мають служыти... Ян Шымковичъ на кони з сагайдакомъ, съ кордомъ. Размус Война выслалъ 3 слугу на мер. в панъ., з сагайдакомъ, з ощепы...”*

**Статут Літоўскі 1529**



Статут — звод законаў Вялікага княства Літоўскага, які складаў прававую аснову дзяржавы. Выдаваўся тройчы — 1529, 1566 і 1588 гадах. Дзейнічаў да 1840 года.

*"І ў тым заключаецца наша вольнасьць, якою мы ганарымся між іншых народаў хрысціянскіх, што гасудар намі кіруе ня па волі сваёй уласнай, а згодна праву нашаму ..."*

Згодна Статуту ВКЛ 1566 г. (арт. 9, раздзел 3) — “Але на достоенства и всякій врядъ духовный и свѢцкій не маеть быти обиранъ, ани отъ насъ Господаря ставленъ, толко здавна продковъ своихъ уроженецъ Великого Князства Литовского Литвинъ и Русинъ…”

І калі прагледзіць спісы вялікіх канцлераў, гетманаў і маршалкаў — заўважым літвінаў і русінаў: Хадкевічаў, Радзівілаў, Астрожскіх, Агінскіх. Але не заўважым аніводнага “літоўца” кшталту Іонас Баланаускас.

**Лівонская вайна 1558-1583 і Люблінская унія 1569**

Лівонская вайна — самая доўгая бесперапынная вайна ў нашаей гісторыі (25 год). Цягам яе маскавітамі быў часова захоплены і зруйнаваны Полацк, жыхары прададзены ў рабства. Болей горад да мінулай уплыўнасьці ўжо не адрадзіўся.

Вайна прымусіла ВКЛ да Люблінскай уніі, павялічыўшай уплыў Польшчы на жыцьце ВКЛ. Згодна ўмоў уніі, Землі Рускія (Украіна) адыйшлі ад ВКЛ да Польшчы.

Вайна распачалася ў выніку спробы Маскоўскага цара Івана IV Жахлівага захапіць Лівонію. З-за пагрозы знішчэньня, Лівонская канфедэрацыя пайшла пад пратэктрат ВКЛ — часткай пераўтваралася ў васальнае герцагства Курляндыя і Семігалія, часткай непасрэдна ўвайшла ў склад ВКЛ. Пачалася вайна паміж ВКЛ і Маскоўскім царствам.

Праз 10 год вайны, у 1569 годзе, пасьля страты Полацку і ў выніку агульнага цяжкага становішча ВКЛ, Жыгімонт II Аўгуст — апошні з Ягелонаў, — зацьвердзіў Люблінскю унію, падрыхтаваную Соймамі Літвы і Польшчы.

Так, дзеля абароны ад сталага ворага, з Польшчы і ВКЛ склалася новая федэратыўная дзяржава — Рэч Паспалітая.




Адна з памятных дат той вайны — 27 студзеня 1564 г. — дзень перамогі пад Чашнікамі на рацэ Ула. Там 6-тыс. войска Радзівіла Рудога і Грыгора Хадкевіча разграміла 20-тыс. маскоўскую армію.

Вайну скончваў ўжо новы кароль і в. князь — Стэфан Баторый. Па выніках вайны межы з Маскоўскім царствам амаль не зьмяніліся. А палітычнае становішча Вялікага княства стала зусім іншым.

**Люблінская унія 1569** — дзяржаўны саюз паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім княствам Літоўскім, паклала пачатак адзінай федэратыўнай дзяржаве — Рэчы Паспалітай. *Rzeczpospolita* (польск.) — *Res Publica* (лац.) — *Агульная справа* (рэспубліка). Згодна уніі да Польшчы адыйшлі Землі Рускія.

# Рэч Паспалітая 1569-1795

Па Люблінскай уніі 1569 г. была утворана Рэч Паспалітая. Пад дэвізам *Si Deus Nobiscum quis contra nos* (*Калі з намі Бог, то хто супраць нас*), яно было ўплыўнай эўрапейскай краінай наступныя 200 год.

За ВКЛ захоўвалася дзяржаўнасьць у выглядзе ўласных: права (Статут) і суда, адміністрацыі (канцлеры, гетманы, маршалкі), войска, казны і дзяржаўнай беларускай мовы.

Польшча і ВКЛ мелі агульнага абранага (!!) караля-вялікага князя, Сойм, грошы і аб'ядноўвалі войскі дзеля абароны дзяржавы. Мелі агульную знешнюю палітыку і мытныя мяжы.

**Акт Варшаўскай канфедерацыі 1573**

Рэлігійныя супярэчнасьці і нявырашаныя пытаньні спадкаемкасьці каралеўскай улады спарадзілі два гістарычных дакумэнта.

Акт Варшаўскай канфедэрацыі  28 студзеня 1573.

Варшаўская канфедэрацыя заклала асновы рэлігійнай памяркоўнасьці на абшары Рэчы Паспалітай. Яна была прынята ў смутны час "бескаралеўя" — у 1572 памёр Жыгімонт III Аўгуст, зь ім спынілася дынастыя Ягелонаў. Наступны кароль, Генрых Валуа, будзе каранаваны толькі ў 1574.

Канфедэрацыя мела мэтай пераадолець узнікшыя праблемы Рэчы Паспалітай, якая мела адзінага караля (а на той момант не мела й яго), але не мела агульнай царквы.

І калі ў Польшчы дамінавалі каталікі, то рэлігійная палітра ВКЛ была даволі стракатай — на ўсходніх землях пераважала праваслаўе, на заходніх каталіцызм. На поўначы і захадзе распаўсюджваліся ідэі Рэфармацыі. З часоў Вітаўта ў ВКЛ пражывала вялікая іудэйская абшчына.

Нагадаем, што ў тагачаснай Эўропе пракатваліся хвалі рэлігійных войн. Так, знакамітая "Варфаламееўская ноч" адбылася ў папярэднім 1572 годзе.

Акт канфедэрацыі, § 5. — *" А паколькі ў Рэчы Паспалітай нашай ёсьць адрозненьні немалыя ў веры хрысціянскай, прадухіляючы тое, каб з гэтаей нагоды паміж людзьмі нязгода якая шкодная не пачалася, якую па іншых каралеўствах мы ясна бачым, абяцаем сумесна, ад імя нашага і нашчадкаў нашых, і на вечныя часы прысягаем верай, гонарам і годнасьцю нашымі, што*

*калі розьнімся ў веры, мір паміж сабою захоўваць, а з-за розніцы ў веры і абрадах царкоўных крыві не праліваць, а таксама не караць ні канфіскацыяй, ні пазбаўленьнем гонару…”*

**Генрыкавы артыкулы 1573 і абраныя каралі 1574**

У Рэчы Паспалітай каороль і в. князь абіраўся Соймам і ня меў перадаваць ўладу сваім нашчадкам. Абсалютная манархія прыйдзе ў наш Край толькі да XIX ст. на расейскіх багнетах.

Першым абраным каралем і в. князем стаў Генрых Валуа, сын караля Францыі.

Паколькі маці Генрыха, Кацярына Медычы, уславілася як аўтарка той самай Варфаламеевай ночы — калі на рэлігійнай падставе былі знішчаны каля 30 тыс. пратэстантаў, — то па патрабаваньні дысідэнтаў (некаталікоў) Рэчы Паспалітай былі складзены *Генрыкавы артыкулы*, якія ён мусіў быў падпісаць перад каранацыяй.

Артыкулы абмяжоўвалі ўладу караля і забяспечвалі рэлігійную свабоду. Непарушнасьць гэтых артыкулаў зацьверджвалася клятвай:

*—"У выпадку ж, калі мы (ад чаго барані Божа!) не выканаем гэтых артыкулаў або ўмоў, або ўчынім што-небудзь насуперак ім, законам і вольнасьцям, то ўсіх жыхароў каралеўства і вялікага княства аб'яўляем свабоднымі ад належнага нам падпарадкаваньня і вернасьці ".*

Генрыкавы артыкулы зацьверджваліся ўсімі наступнымі кіраўнікамі Рэчы Паспалітай і канчаткова ўзаконілі сістэму *шляхецкай дэмакратыі*.

Генрыу Валуа польскім каралем быў не доўга — быў абраны і сыйшоў з пасады ў 1574 годзе, на карысьць магчымасьці заняць пасаду караля Францыі.

Наступным каралем і в. князем быў абраны сын ваяводы Трансільваніі — Стэфан Баторый. Трымаў уладу 1575-1586 гг. З трыюмфам скончыў Ліовонскую вайну і увёў Грыгарыянскі каляндар (у Расеі быў уведзяны толькі ў 1918).

Ён запрасіў у краіну езуітаў, якія мелі найлепшую ў Эўропе сістэму адукацыі — і яны распаўсюдзілі яе тут (школы і калегіюмы). Нагадаем — туды прымаліся дзеці незалежна ад веравызначэньня і сацыяльнага статуса. І *забаранялася* гвалтам пераконваць іх у каталіцтва. Баторый плянаваў перанесьці сталіцу ў Гародню, дзе жыў апошнія гады і дзе сыйшоў з жыцьця ў 1586 годзе.

**Берасьцейская царкоўная унія 1596**

Царкоўная унія — з'яднаньне Рымскай і Візантыйскай хрысьціянскіх канфэсій. Праваслаўныя заставаліся праваслаўнымі, проста біскупы дамовіліся, што цяпер яны пераходзяць (ці вяртаюцца ў каталіцкім разуменьні) у еднасьць з Рымам, захоўваючы свае традыцыі і абрады.

Акт Уніі быў падпісаны ў Рыме 23 снежня 1595 года і зацьверджаны 9 кастрычніка 1596 года на уніяцкім саборы ў Бярэсьці, і стаў лягічным падоўжаньнем Фларэнтыйскай уніі 1439 года.

*"Унія не была выпадковымі з'явай; яна не была і вынікам асабістых толькі разлікаў і свавольных дзеяньняў асобных прадстаўнікоў царкоўнай іерархіі. Яна была абумоўлена гістарычнай жыцьцём царквы ў Літве і зьявілася яе прамым вынікам.."* Энцыклапедычны слоўнік Бракгаўза і Эфрона, 1890.

Спробы стварыць альбо незалежную, альбо уніяцкую ўласную царкву былі яшчэ з часоў Вітаўта. Але ў XVI ст. гэта быў ўжо не рэлігійны, а цывілізацыйны выбар. Падпарадкаваньне праваслаўных Літвы маскоўскаму мітрапаліту дазваляла Маскве сваекарысна ўплываць на ўнутраныя справы ВКЛ і ўвогуле падтымлівала цемрашэльства.

Дастаткова параўнаць першыя артыкулы Літоўскага Статута (1529-1840) і Маскоўскага Саборнага ўкладаньня (1649-1832) — асноўных законаў адпаведных краін.

*— "Артыкулъ I. Вси обыватели Великого Князства Литовского однымъ правомъ писанымъ, отъ насъ данымъ, сужоны быти мають"*

*—"Глава I. Буде кто... возложитъ хулу на Господа Бога... и того богохульника обличивъ казнити, сжечъ."*

Разам з магчымасьцю рэлігійнага замірэньня, Унія ўзняла на якасна новы ўзровень усеагульную адукацыю — па ўсёй краіне адкрываліся школы і калегіумы езуітаў і базыльянаў (уніяцкі манаскі Ордэн, якія прыняў езуіцкія стандарты навучаньня, лепшыя ў Эўропе).

Праз 200 год праваслаўных ў ВКЛ налічвалася каля 6%. Езуіцкіх і базыльянскіх стандартаў усеагульнай адукацыі Расейская імпэрыя не дасягнула да самага сайго скону. Праваслаўным царкоўна-прыходзкім школам А. П. Чэхаў прысьвеціў апавяданьне "Кашмар".

**Вайна за Эстляндыю 1600-1611**

Пасьля Стэфана Баторыя пасаду караля і в. князя займаў Жыгімонт III Ваза (1587-1632), абраны пазьней таксама і каралем Швэцыі (1592-1599).

Ён імкнуўся з’яднаць пад сваёў уладай Швэцыю і Рэч Паспалітую. Кароткі час яму гэта ўдавалася  — на 1592-99 ён аб'яднаў пад асабістай уніяй абедзве дзяржавы, але шведскі парламент выбраў рэгента, падтрымліваючага пратэстантаў, а не Рымскую царкву. У далейшым Жыгімонт раз-параз спрабаваў вярнуь сабе страчаную швэцкую карону.

Вынікам такой спробы была вайна за Эстляндыю (паўночную частку Лівоніі). Камандуючым войскам быў вызначаны Ян Караль Хадкевіч. Ён атрымаў некалькі ўражваючых перамог — так, ягоная перамога пад Кірхгольмам (каля Рыгі) 27 верасьня 1605 года стала падставай стварэньня Менскім ваяводай Хрыстафорам Завішай эпаса “Караламахія”.

Але недастатковае забеспячэньне войска і ўнутраныя праблемы (ракош шляхты супраць узмацненьня каралеўскай улады) не дазволілі Рэчы Паспалітай скарыстацца вынікамі перамог. Пасля вайны мяжы засталіся ранейшымі.

Цягам вайны Масква увайшла ў хаўрус са Швэцыяй і вайна падоўжылася ўжо з Маскоўскім царствам.



**Вайна за Маскву 1609-1618 і ўзяцьце Крамля**

У Маскоўскім царстве йдзе “Смутны час”. Забіты царэвіч Дзімітрый; памер Барыс Гадуноў; голад і сялянскае паўстаньне Балотнікава; прэтэндэнты-Ілжэдзімітрыі; Васіль IV Шуйскі на троне.

За дапамогу супраць чарговага Ілжэдзімітрыя цар Шуйскі ўваходзіць у хаўрус са Швэцыяй і ўступае ў вайну супраць Рэчы Паспалітай.

4 ліпеня 1610 года маскойскае войска было ўшэнт разьбіта пад Клушыным і амаль перастала існаваць. 20 верасьня нашае войска ўвайшло ў Крэмаль. Маскоўскі ўрад (Семібаяршчына) прызнал Уладзіслава, старэйшага сына Жыгімонта ІІІ, царом і чаканіл ад імя "Уладзіслава Жігімонтовіча" манэту. Але Уладзіслаў праваслаўя не прыняў і ў Маскву не прыбыў . Лічыўся Маскоўскім царом да 1634 году.

Дэвулінскае перамір’е, што замацавала вынікі вайны, з боку ВКЛ падпісваў Леў Сапега, фундатар трэцяга выданьня Статуту. Да ВКЛ быў вазвернуты Смаленск, захоплены Масквой у 1514 г..У памяць аб нашых войсках у Крамлі і абраньні Уладіслава Вазы царом сеньня РФ святкуе 4 лістапада як дзяржаўнае сьвята.



Рэч Паспалітая 1619
пасьля вайны з Маскоўскім царствам 1609-1618 і ўзяцьця Крамля (1610-1612). Вяртаньне Смаленска

**Крывавы Патоп 1654-1677**

Самая крывапралітная вайна ў нашаеі гісторыі. Калі для Польшчы “Патопам" была вайна са Швецыяй 1655-1660 , то для ВКЛ ім была вайна 1654-1667 з Маскоўскім царствам. Чалавечыя страты па нашым ўсходнім ваяводствам даходзілі да 70%. Агульныя людзкія страты каля 40%.

На Землях Рускіх, што адыйшлі ад ВКЛ да Польшчы па Люблінскай уніі, складаныя стасункі паміж казацтвам і новай польскай шляхтай прыводзілі да шматлікіх паўстаньняў. Часам у сваіх рабаўнічых набегах казакі заходзілі ў межы ВКЛ, але посьпеху тут не мелі. Так, двойчы запар, Януш Радзівіл разьбіваў праўзыходныя сілы Войска Запарожскага ў бітвах пад Лоевам ў 1649 і 1651 гадах.

За часам  паўстанья Хмяльніцкага, на Пераяслаўскай Радзе 1654 года, Войска Запарожскае зьвярнулася да Маскоўскага царства і прынесла прысягу цару.



Атрымаўшы хаўруснікаў у асобе Запарожскага Войска, Маскоўскае царства распачало вайну супраць Вялікага княства Літоўскага. Тым жа часам Швэцыя пачала наступ на Самагітыю и Польшчу. Пачаўся 13-гадовы Крвывы Патоп 1654-1667 гадоў.

У 1658 г. адбылася першая спроба стварыць Рэч Паспалітую Трох Народаў (з русінамі-украінцамі, што не абралі бок Масквы), як абарону ад маскоўскай экспансіі. Але гэта распачало грамадзянскую вайну ва Украіне.

Усё ВКЛ было акупавана Масквой і амаль уся Польшча — Швэцыяй. Злом у барацьбе з маскоўскім царствам наступіў 28 чэрвеня 1660 года, пасьля перамогі пад Палонкай, дзе 12-тыс.  войска в. гетмана Яна Паўла Сапегі перамагло 20-тыс. маскоўскую армію. Поўнае вызваленьне краіны расьцягнулася яшчэ на 7 год.




Па выніку вайны Польша страціла левабярэжную Украіну,  ВКЛ страціла Смаленск, амаль палову насельніцтва і ўвогуле прыйшло ў заняпад.

**Грамадзянская вайна 1696-1702**

Неабмежаваная шляхецкая дэмакратыя парадзіла магнацкую анархію. Напрыканцы XVII ст. уся ўлада ў ВКЛ была засяроджана ў роду Сапегаў. Бенедыкт Павел, в. падскарбі Літоўскі, кантраляваў фінансы, а ягоны брат, Ян Казімір, вялікі гетман Літоўскі — войска. У Ружанскім палаце Сапегаў захоўвалася казна ВКЛ. Замежныя дыпляматы лічылі Бенедыкта ўладаром Вялікага княства.

1696 год. Абраньне новага караля і в. князя пасьля сьмерці Яна III Сабескага раскалола літоўскую шляхту. Сапегі падтрымлівалі кандыдатуру французскага прынца Луі дэ Конці, іншыя — саксонскага курфюрста Фрыдрыха Аўгуста.

У перыяд “бескаралеўя” паміж магнацкай канфедэрацыяй Агінскіх, Радзівілаў, Пацаў, Вішнявецкіх і Сапегамі пачалася вайна за ўладу ў ВКЛ, у якой Сапегі пацярпелі паразу. Былоя “адзінаўладдзе” Сапегаў зьмянілася на ўладу рознаўплывовых магнацкіх радоў. Намечаныя Сапегамі і неабходныя княству рэформы так і не адбыліся.



Ружаны. Палац Сапегаў


**Вялікая Паўночная вайна 1700-1721**

Паўночная вайна — вайна паміж Швэцыяй з аднаго боку і Расеяй, Саксоніяй ды інш. з другога, за авалоданьне Балтыйскім узбярэжжам.

Абраны ў 1697 годзе каралем Рэчы Паспалітай саксонскі курфюрст Фрыдрых Аўгуст выступіў на баку Расеі і Саксоніі.

Лепш за ўсе апісаў гэты час А. Тарас

— *"Тое, што адбылося з Рэччу Паспалітай, у тым ліку з Вялікім Княствам Літоўскім у гэты перыяд, не ўкладаецца ў звычайны ход гістарычных працэсаў. Велізарная дзяржава пацярпела дэмаграфічную і эканамічную катастрофу толькі таму, што заняўшы трон саксонскі курфюрст Аўгуст уцягнуў краіну ў канфлікт, які перасьледваў інтарэсы зусім іншай дзяржавы — Саксоніі. "*






Акрамя ўсеагульнага заняпаду па вынікам вайны, гэты час застаўся ў памяці нашай краіны праз два знакамітых учынка нашага саюзніка Пятра I.

— знішчэньне Полацкага сабору св. Сафіі, які 1 мая 1710 года ўзарвала адыходзячае расейскае войска

— знішчэньне Магілева, па ліку жыхароў і іх багацьця другога горада ВКЛ пасьля Вільні. *«Пётр I заўважыў заможнасьць жыхароў Магілёва і, баючыся, каб Карл XII ня выбраў яго пунктам апоры ў ваенных выправах, загадаў двум палкам – калмыцкаму і татарскаму, спаліць горад. І гэты жудасны загад 8 верасьня 1708 года ў дакладнасьці быў выканан. Увесь горад быў ператвораны ў руіны і папялішчы».* А.Г. Киркор, «Живописная Россия» т.3 ч.2 стр. 497

**Шляхецкія канфедэрацыі 1715-1792**

*Шляхецкая дэмакратыя*, меўшая шмат станоўчых рысаў, у неабмежаванасьці сваёй мела і адваротны бок. Права *Liberum veto* дазваляла любому дэпутату спыніць абмяркоўваньне любога пытаньня альбо працу сойма ўвогуле. Моцная цэнтральная ўлада адсутнічала, неабходныя рэформы не праводзіліся.

На фоне агульнага заняпаду краіны за часам Паўднеавай вайны і зусім не станоўчага ўплыву суседзяў — Саксоніі і Расеі, — шляхта (складала каля 15% ад

усяго насельніцтва) імкнулася ўплываць на бягучае становішча праз збор шляхецкіх канфедэрацый. *Канфедэрацыя* — часовы палітычны (часам узброены) хаўрус шляхты ў Рэчы Паспалітай.

Цягам стагодьдзя адбылося сем канфедэрацый — Тарнагародзкая, Віленская, Слуцкая, Таруньская, Радомская, Барская і Таргавіцкая. Звычайна накіраваныя *супраць* чагосьці. Супраць расейскага ўплыву, супраць ушчамленьня дысідэнтаў-некаталікоў, супараць узмацненьня каралеўскай улады, супраць Канстытуцыі, …

Гэтыя выправы, як і прыняцьце Канстытуцыі 3 мая, накіраваныя на выпраўленьне занядбалага стану краіны, станоўчага выніку не атрымалі. У здушэньні тутэйшых канфедэрацый прымаў актыўны ўдзел расейскі генерал А. Сувораў.

**Канстытуцыя 3 мая 1791**

Каб узняць краіну з заняпаду, працаваў Чатырохгадовы або Вялікі Сойм ( 1788-1792), які намагаўся здзейсьніць пераўтварэньні ў грамадска-палітычным стане краіны. Яго мэтамі былі аднаўленьне суверэнітэту і рэфармаваньне дзяржавы.

* Пачатку работы Вялкіга Сойма паярэднічаў Першы падзел Рэчы Паспалітай 1772 году. Цягам працы сойма здзейсьнілася Вялікая французская рэвалюцыя 1789 г., якая зрынула феадальную арыстакратыю (узяцьце Бастыліі) .

Галоўным дасягненьнем Сойма было прыняцьце ў 1791 годзе *Канстытуцыі 3 мая*. Дакумант стаў другой ў гісторыі кадыфікаванай нацыянальнай канстытуцыяй пасьля Канстытуцыі ЗША.

Але спыніць суседзяў — Расею, Аўстрыю і Прусію, — ужо раздзіраўшых Рэч Паспалітую паміж сабою, не адбылося.



Прыняцьце Канстытуцыі 3 мая і калюмны-помнікі ёй у м. Глыбокае і м. Магілёўцы (РБ)

**Падзелы Рэчы Паспалітай 1772, 1792, 1795**

Ад сярэдзіны XVIII стагодьдзя Рэч Паспалітая ўжо не была ў поўнай меры незалежнай. Расейскія імпэратары аказвалі непасрэдны ўплыў на яе ўнутраныя справы, падмацоўваючы палітычны ціск размешчанымі ў краіне войскамі.

1772 Першы Раздзел. Расія, Аўстрыя і Прусія падпісалі ў Вене канвенцыю аб падзеле Рэчы Паспалітай. Іх войскі адначасова ўвайшлі на тэрыторыю краіны і занялі вобласці, размеркаваныя паміж імі па пагадненьні.

Не маючы магчымасці адстаяць цэласнасць краіны ўзброеным шляхам, шляхта спрабавала не дапусціць зацвярджэньня яго юрыдычна. Сумесна з іншымі шляхцічамі, сярод якіх былі Самуэль Корсак (Наўгародак) і Станіслаў Багушэвіч (Мінск), Тадэвуш Рэйтан (Наўгародак) спрабаваў сарваць сойм, каб не дапусціць сцвярджэньня Першага падзелу. Калі ўсе фармальныя юрыдычныя сродкі былі вычарпаныя, Тадэвуш Рэйтан, дамагаючыся ад Сойма пратэсту супраць Падзелу, лёг перад выхадам са словамі: "Забіце мяне, не забівайце Бацькаўшчыну!".



1791 Прыняцьце Канстытуцыі 3 мая выклікала ваенна-палітычны ціск з боку Расеі, якая баялася аднаўленьня Рэчы Паспалітай у межах 1772 года.

1793 Другі Раздзел. Прусія і Расея падпісалі канвенцыю аб другім падзеле Рэчы Паспалітай.

*Пасля другога падзелу Расейскай Імператарскай АН было складзена першае "Описание всех обитающих в Российском государстве народов". *Народ польскі*, з захопленых нашых ўсходніх ваяводстваў, быў абвешчаны " часткай Расійскага народа" (тэрмін "рускі народ" быў яшчэ невядомы). Пакуль яшчэ няма стогнаў аб "горкай долі мужыка-беларуса" — *"Рознай жывёлы і птушкі амаль кожны пасялянін мае для гаспадарчага свайго ўжытку дастатковую колькасьць"(с).*

1794-95 Паўстаньне Тадэвуша Касцюшкі. Идею восстания горячо поддерживал В. И. Ленин:

*— "Никто не повинен в том, если он родился рабом; но раб, который не только чуждается стремлений к своей свободе, но оправдывает и прикрашивает свое рабство (например, называет удушение Польши “защитой отечества” великороссов), такой раб есть вызывающий законное чувство негодования, презрения и омерзения холуй и хам".* В. Ленин "О национальной гордости великороссов" ПСС т. 26, стр. 106-110

1795 Трэці падзел. Кароль Станіслаў Аўгуст II Панятоўскі склаў свае паўнамоцтвы 25 лістапада.

XIX стагодьдзе — наш Край упершыню ўвайшоў у склад Маскоўскай дзяржавы.




Щит соединенных гербов
Княжеств и Областей Бело-Русских и Литовских:
1 — Литовский (Виленская, Гродненская, Минская губ.)
2 — Белостокский (Подляшье)
3 — Полоцкий 4 — Мстиславский
5 — Витебский 6— Самогитский (Жемайтия и Аукштайтия)




Герб Российской Империи

# Паўночна-Заходні край 1795-1918

Пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай многае зьмянілася ў Паўночна-Заходнім краі, былым Вялікім княстве Літоўскім:

- скасавана Магдэбургскае права і самакіраваньне гарадоў
- гарада страцілі свой статус грамадска-культурных цэнтраў
- мястэчкі страцілі свой статус і былі прыраўнаныя да сяла
- пачалася рэлігійная экспансія Маскоўскага патрыярхату РПЦ, руйнуецца стракатая рэлігійная карціна ВКЛ-Беларусі
- адбыўся "разбор шляхты" (звыш 15% насельніцтва) — засьцянковая шляхта і панцырныя баяры былі запісаныя сялянамі пагалоўна
- з'явілася прыгоннае права
- з'явіўся рэкруцкі набор (воинская повинность)
- зруйнавана сістэма адукацыі, створаная езітамі і бызыл’янамі
- ўведзена цэнзура, ніколі не існаваўшая ў ВКЛ



**Вайна Напалеона з Расеяй 1812-1814**

*"Што тычыцца вайны паміж Расеі і Францыяй, то нашыя продкі удзельнічалі ў ёй з абодвух бакоў. Адны служылі цару Аляксандру, іншыя — імператару Напалеону, а сяляне трымалі абарону ад марадзёраў з усіх бакоў. Менавіта таму мы не лічым тую далёкую вайну Айчыннай. для нашых продкаў яна хутчэй была грамадзянскай.*

*Трагедыяй было тое, што нашай моладзі прыйшлося ваяваць адзін супраць аднаго ў войсках супернікаў. Больш за палову ўсіх баявых дзеяньняў у гэтую вайну былі на тэрыторыі Беларусі. "* А. Тарас




**Таварыства філаматаў і філарэтаў 1817-1823**

Філаматы (грэч. "імкнецца да ведаў") — тайнае патрыятычнае і асветніцкае аб'яднаньне студэнтаў Віленскага універсітэта і Свіслацкай гімназіі, якое дзейнічала ў 1817-23 гадах, чальцамі якога была моладзь 18-24 гадоў,  стаўшая апасьля выбітнымі паэтмі, навукоўцамі, грамадскімі дзеячамі (А.Міцкевіч, І.Дамейка, …)




Філаматаў заклалі асновы сучаснай самаідэнтыфікацыі краю — *тутэйшае краевасьці*, якая складзе аснову беларускага нацыяналізму 1890-1930 гадоў.

Свае творы яны пісалі на польскай — афіцыйнай мове навучаньня (Віленскі універсітэт, Полацкая езуіцкая Акадэмія і інш.) і мове гараджан таго часу (аналаг рускай сёньня). У той жа час называлі сябе не палякамі, а "літвінамі", зьвярталіся ў сваіх творах да вобразаў "гістарычнай Літвы" (ВКЛ), выкарыстоўвалі элементы "тутэйшай" мовы ( "Dziady" Міцкевіча).

Пасля арыштаў ў 1823 г. пад суд было аддадзена 108 удзельнікаў. Матэрылы следчага камітэту выкладзены ў рапарце "К истории тайных обществ и кружков", 1824.

**Паўстаньне 1830-1831**

Рэвалюцыя 1830 году ў Францыі выступіла каталізатарам. У царстве Польскім (Польшча пасьля вайны 1812-14 гг.) 29 лістапада 1830 года выбухнула паўстаньне. У кароткі тэрмін ўся тэрыторыя царства была вызвалена ад рускай улады.

У Паўночна-Заходнім краі паўстаньне падтрымала 30 інсургенцкіх атрадаў (каля 12 тыс. чалавек). Сярод інсургентаў былі такія людзі як Напалеон Орда, Ігнацы Дамейка, Эмілія Плятэр. Старшынёй Часовага ўрада Літвы быў Тадэвуш Тышкевіч — "граф на Лагойску і Бярдзічаве".

На пачатку жніўня 1831 года на ўсёй тэрыторыі Беларусі паўстаньне было здушана. Шмат інсургентаў пакінулі радзіму і пазьней удзельнічалі ў барацьбе за свабоду ў розных краінах Еўропы.

*Эмігранцкае *“Таварыства Літоўскае і Зямель Рускіх”* без усялякага антаганізму ўжывала геаграфічны тэрмін *Белая русь*. Але сабе яны па-ранейшаму лічылі *літвінамі*.



**Паўстаньне 1863 Каліноўскага**

*"З сёньняшняга дня ўсе сяляне і іншыя жыхары любой веры вольныя, нібы нашчадкавая шляхта"* Маніфэст ад 20 студзеня 1863 года.

Паўстаньне на тэрыторыі Царства Польскага, Паўночна-Заходняга краю і Валыні. Пачалося 22 студзеня 1863 года і працягвалася да восені 1864 года. Інсургенты імкнуліся да аднаўленьня незалежнасьці Края, правядзеньня аграрных рэформаў, дэмакратызацыі. Нацыянальна-вызвольны рух дзяліўся на два крыла:

"белыя" —сярэднія і буйныя землеўладальнікі, прадстаўнікі буйной буржуазіі. І "чырвоныя" —прадстаўленыя дробнай шляхтай, служачымі і чыноўнікамі.

У адрозненне ад Польшчы, вядучая роля ў падрыхтоўцы паўстання на землях ВКЛ належала "чырвоным" — гараджане, засцянковая шляхта, студэнты. Адным з нямногіх гарадоў, занятых паўстанцамі, былі Горкі, дзе месьціўся Горы-Горацкі земляробчы інстытут.




На тэрыторыі Літвы-Беларусі паўстаньне ўзначальваў Канстанцін Каліноўскі, кіраўнік Літоўскага правінцыйнага камітэта. *“Каліноўскі з настроем герценаўскай школы на чале амбіцыйных асоб з чырвоных літвінаў настойліва праводзіў ідэю аб самастойнасьці Літвы”*.

Каліноўскі выдваў першую беларускамоўную газэту — “Mużyckaja prauda”. Пекны прыклад *беларускай лацінкі*. Менавіта на лацінке ўзрасла сучасная беларуская літаратура — яна была нашым асноўным альфабэтам да 20-х гадоў XX ст.



PISMO AD JASKA HASPADARA S PAD WILNI

DA MUŻYKOW ZIEMLI POLSKOJ.

DZIACIUKI!

Kabi Boh dau mnie rozum, to ja wam budu radzić jak rabici treba, kab było pa sprawiedliwości i pa praudzie, a kali wy majecie rozum to mienie posłuchajecie.

Jak tolko zapamiatajuć naszyje baćki, maskal żyu adno aszukaństwom i nieczystaju siłaju. Pakasawau jon usio dobroje, a ustanawi szto adno może wydumać czartouskaja chitrość. Byli małyje padatki, a jon-horło jeho nie sytoje, ustanawiu wielikije, jakich nie ma na caluśkom świeci; byli prywilei Karalou Polskich, a ciepier hdzie jeny? Synou naszych bieruć w rekruty, da i honiać czort wiedaje hdzie, kab prapadali marnie jak sabaki. Narod hinie, nie

Szto da mienie, to ja Wam, Dziaciuki, kazu, bierecie za kosy, heto maja rada, a na wieki rozstaniem sia z maskalom pahanym, z jeho zdzierstwom, z jeho syzmoju, z jeho rekrutczynaju, z jego sabaczymi pamierami i abrokami.

JAŚKO haspadar s pad Wilni.

10 (22) сакавіка 1864 года Каліноўскі быў пакараны сьмерцю ў Вільні царскімі ўладамі.

# Беларусь 1918-1991

**Першая Сусветная вайна 1914** (28.07. 1914 - 11.11. 1918). Па яе сканчэньні былі скасаваны чатыры імпэрыі — Расейская, Асманская, Аўстра-Вугоршчына і Германскі Kaiserreich.

1917 У выніку Лютаўскай рэвалюцыі ў Расейскай імпэрыі да ўлады прыйшоў Чаовы Урад. Дзяржава пачала шлях да дэмакратычнага кіраваньня. Большасьць дзеячоў нацыянальна-вызваленчых рухаў схіляліся да ўдзелу ў федэратыўным складзе новай агульнай дзяржавы.

Шляхам Кастрычніцкага перавароту да ўлады прыходзяць бальшавікі. Расея выходзіць з хаўруса з астатняй Антантай (Англія, Францыя) і праз замірэньне ў Солах рыхтуецца да міру з Германіяй. У Расеі пачынаецца грамадзянская вайна. Першы Усебеларускі з’езд абірае шлях будаваньня незалежнай дзяржавы.

Германія напярэдадні заключэньня міру з Расеяй займае Латвію, Эстонію, Менск, Гомель, Оршу, Магілеў, Чарнігаў.

**Беларуская Народная Рэспубліка (БНР) 1918**

На адарваных ад былой Расейскай імпэрыі тэрыторыях адразу пайшоў працэс нацыянальнага самавызначэньня — былі абвешчаны Літоўская рэспубліка (16.02.1918), Эстонская рэспубліка (24.02.1918), БНР (25.03.1918), Латвійская рэспубліка (18.11.1918).

Але, калі краіны Прыбалтыцы разглядаліся Германіяй як безумоўная *Пруская спадчына* (германскі прынц нават быў запрошаны на пасаду літоўскага караля Міндаўгаса II) і атрымлівалі дапамогу ў фармаваньні войска і ўладных структураў, наш Край разглядался ў якасьці істоты гандлю на Берасьцейскій перамовах і аніякай падтрымкі не вынаходзіў.

Абвешчаная БНР мела больш атрыбутаў незалежнай дзяржавы, чым БССР — свае пашпарты і замежныя прадстаўніцтва, сваю дзяржаўную мову, войска, вышэйшую ўрадавую ўстанову і нацыянальную сістэму адукацыі.

Пасля адыходу нямецкіх войск Менск быў заняты Чырвонай Арміяй. Рада і ўрад БНР пераехалі ў Вільню, а 27 снежня 1918 — у Гародню. На гэтым гісторыя існаваньня БНР амаль скончваецца — на кароткі час яна акрыяе пад час Слуцкага Збройнага Чыну.




*У 1918 годзе былі абвешчаны першыя Савецкія Рэспублікі ў складзе Расеі: Терская, Таврическая, Донская, Кубано-Черноморская, Ставропольская. І дзе яны зараз?

**БССР у складзе СССР 1919-1991**

У складзе СССР было больш за 200 народаў і ўсяго 15 Саюзных Рэспублік, якія сфармаваліся толькі там, дзе быў моцны нацыянальны рух, скіраваны на стварэньне сваей незалежнай дзяржавы.

1 студзеня 1919 было абвешчана стварэньне Советской Социалистической Республики Белоруссия (ССРБ) у складзе РСФСР са сталіцаў у Смаленску.




* 1920 **Сярэдняя Літва** (Віленскі край). 1-я Літоўска-Беларуская дывізія Люцыяна Жэлігоўскага — літвіна з-пад Ашмян , — заняла  Вільню. *“Тое панства [Рэч Паспалітая] было збудавана праз народ беларускій і польскій… Літва была панствам славянскім… Пад час вайны генералу Людэндорфу ўдалося праз народ Жмудзінаў зрабіць фальш з гісторыі Літвы..”(с)* Сярэдняя Літва існавала па 1922 год, калі шляхам галасаваньня была інкарпарыравана ў склад Польшчы.

Тыя, хто імкнуўся застацца часткай Расеі, імі і засталіся. Нават Сібірская Рэспубліка, меўшая 60-тысячнае войска, самаліквідавалася на карысьць быць часткай новай імпэрыі. Зараз гэта наўпрост "федеральный округ" альбо па-просту "нейкае нешта недзе за Уралам".

**Рэспубліка Беларусь 1991**

1991 год — СССР, нашчадак Расейскай Імпэрыі, з-за сістэмнай дэзінтэграцыі ва ўсіх галінах : эканоіміке, сацыяльных структурах, грамадскай і палітычнай сферах, — сканаў без аніякаў знешняй ваеннай пагрозы.

Згодна Белавежскім пагадненьям ад 8 сьнежня 1991 года СССР перастаў існаваць.

27 ліпеня 1990 года была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. У 1991 БССР была абвешчана як Рэспублікай Беларусь, адрадзіўшы свій спрадвечны герб і сьцяг — спадчыну БНР.




Дзяржаўныя межы сучаснай Беларусі дакладней супадаюць з межамі ВКЛ, чым межы РФ — з межамі Расейскай імперыі.

Беларускі этнас склаўся ў XV стагодьдзі, а дзяржаўнасьць — яшчэ раней. Дзяржаўная мова — тая ж, што й 500 гадоў таму. Адкуль бяруцца людзі, якія вядуць нашаю гісторыю з 1917 году?

Прафэсар філасофіі і тэорыі мастацтва Б. Гройс пісаў: *"Усе йдуць да вытокаў, шукаюць культурную ідэнтычнасьць. Усе спрабуюць вызначыцца і знайсьці свае месца праз зварот да вельмі простых формулаў культурнай ідэнтычнасьці.*

*Быў створаны вялізны сусветны рынак, дзе адбываецца канкурэнцыя. Дзеля таго, каб удала канкураваць, трэба мець тое, што завецца "чалавечы капітал", а гэта і ёсьць асновы — сям'я, свая старая культура, традыцыя."*

# Мапы “беларускага племені”

Беларускі этнас склаўся цягам XIV-XV ст. у межах адзінай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

Ад розных пляменаў “балцкіх” культур штрыхаванай керамікі да агульнага “славянкага” народу. Тыя, хто ўспрыняў “славянства” — агульную моўную і культурную ідэнтычнасьць — сталі літвінамі. Карысталіся адзінай мовай, будавалі эўрапейскую краіну і ставілі свайго *"starosta"* кіраваць Самагітыяй.

*“Усе наяўныя сучасныя дадзеныя сведчаць, што папуляцыі карэнных жыхароў Беларусі вядуць свой радавод цягам не меньш за 130-140 пакаленьняў, г.зн. 2500-3000 гадоў”* , — прафесар Магілеўскага універсітэта І.Н. Шарухо



# Вялікія князі ВКЛ

**1236-1295 Літва Міндаўга**

- 1236-1263 Міндаўг, кароль прусаў і літвінаў
- 1263-1264 Тройнат
- 1264-1267 Войшалк, сын Міндаўга
- 1267-1270 Шварн, зяць Міндаў і кароль Русі
- 1270-1295 Тройдзень, Букідыд(?), Будывід(?), інш (?)

**1295-1440 Гедымінавічы**

- 1295-1316 Віцень, старэйшы брат Гедыміна
- 1316-1341 Гедымін
- 1341-1345 Яўнут, сын Гедыміна
- 1345-1377 Альгерд, сын Гедыміна
- 1377-1392 Ягайла, сын Альгерда, унук Гедыміна
- 1381-1382 Кейстут, сын Гедыміна
- 1392-1430 Вітаўт, сын Кейстута, унук Гедыміна
- 1430-1432 Свідрыгайла, сын Альгерда, унук Гедыміна
- 1432-1440 Жыгімонт, сын Кейстута, унук Гедыміна

**1440-1572 Ягелоны, нашчадкі Ягайла і Сафіі Гольшанскай**

- 1440-1492 Казімір IV Ягелон (Ягелончык), сын Ягайла
- 1492-1506 Александар Ягелон, сын Казіміра IV
- 1506-1544 Жігімонт I Стары, сын Казіміра IV
- 1544-1572 Жыгімонт II Аўгуст, сын Жігімонта I Старога

**1572-1795 Абраныя князі ВКЛ і каралі Польшчы**

- 1573-1574 Генрых Валуа, сын караля Францыі Генрыха II
- 1575-1586 Стэфан Баторый, князь Трансільваніі
- 1587-1632 Жігімонт III Ваза, кароль швэдаў, готаў и венедаў
- 1632-1648 Владзіслаў IV Ваза, сын Жігімонта III
- 1648-1668 Ян II Казімір Ваза, сын Жігімонта III
- 1669-1673 Міхаіл Вішнявецкі
- 1673-1696 Ян III Сабескі
- 1697-1704 1709-1733 Аўгуст II Моцны, курфюрст Саксоніі
- 1704-1709 1733-1734 Станіслаў Ляшчынскі
- 1734-1763 Аўгуст III, сын Аўгуста II, курфюрст Саксоніі
- 1764-1795 Станіслаў II Аўгуст Понятоўскі

# Ваяводствы Літвы, Русі і Жмудзі 1684 г.




Ваяводствы Літвы, Русі і Жмудзі

*1684 Justus Danckerts “REGNI POLONIAE Ducatus LITHUANIAE”*

1. Віленскае
2. Браслаўскае
3. Трокскае
4. Жамойцкае староства
5. Падляшскае
6. Берасцейскае
7. Навагародскае
8. Менскае
9. Полацкае
10. Віцебскае
11. Мсціслаўскае
12. Хелмскае
13. Бэльзскае
14. Лембергскае (Pokutia)
15. Камянецкае (Podolia)
16. Брацлаўскае (Podolia)
17. Луцкае (Volhynia)
18. Кіеўскае
19. Княства Чарнігаўскае
20. Княства Ноўгарад-Северскае

# Уніі ВКЛ-Польшча

history-belarus.by

| | |
|---|---|
| **1385** | **Кревская уния**<br>Династический союз между Великим княжеством Литовским и Польшей, по которому в. князь Ягайло, вступив в брак с польской королевой Ядвигой, провозглашался польским королём.<br>Войска, законодательство и судебная система, а также казна оставались раздельными, сохранялись граница и таможня между государствами. |
| **1392** | Гражданская война 1381-84 и 1389-92 (Витовт vs Ягайло). Островское соглашение (Острово близ города Лида) — договор между королём польским Ягайло и князем городненским и трокским Витовтом.<br>Витовт становился Великим князем Литовским, Русским и Жамойтским, но признавал себя вассалом короля Ягайло. Договор ознаменовал окончание Гражданской войны в ВКЛ |
| **1401** | **Виленско-Радомская уния**<br>Договор между в. князем Литовским Витовтом и королем Польши Ягайло.<br>Витовт подписал акт о своей присяге Ягайло. Ягайло признавал Витовта великим князем Литовским.<br>После смерти Витовта его владения должны были отойти Ягайло или его наследникам. |
| **1413** | **Городельская уния**<br>Договор между в. князем Литовским Витовтом и королем Польши Ягайло.<br>Регулировал отношения ВКЛ и Королевства Польского. Вводился наследственный институт в. князя литовского, что отменяло положения Виленско-Радомскиой унии.<br>В ВКЛ вводилось одинаковое с Польшей административное деление, литовские бояре получали права и гербы польской шляхты. |
| **1430** | После смерти Витовта в. князем Литовским становится Свидригайло.<br>Он разрывает союз с Польшей и отказывается присягать Ягайло.<br>*«Я не с его ласки, но с Божьей и по праву природного моего великий князь; имею теперь время отомстить ему за давние обиды, пускай будет благодарен, что я до этого почитаю и уважаю его просто, как старшего брата и короля польского»* |
| **1432** | **Гродненская уния**<br>Договор между королем польским Ягайло и в. князь литовским Сигизмундом, свергнувшим Свидригайло .<br>Уния была заключена в условиях гражданской войны. Возврат к условиям Виленско-Радомской унии 1401 года.<br>Уния действовала до убийства Сигизмунда заговорщиками в 1440 году. |
| **1499** | **Краковско-Виленская уния**<br>Договор между внуками Ягайло — в. князем литовским Александром и его братом, королем Яном Ольбрахтом.<br>Обновление Городельской унии 1413 года.<br>Основной целью обновлённой унии оставался союз при ведении войн: ВКЛ с Москвой и Польши с турками .<br>И впредь ни великий князь литовский не мог быть избран без согласия Польши, ни польский трон не мог быть замещён без согласия литовской шляхты. |
| **1501** | **Мельницкая уния**<br>Принята при избрании королём польским в. князя литовского Александра после смерти его брата, Яна Ольбрахта (оба принимали Краковско-Виленскую унию).<br>Предусматривала создание единого государства и ликвидацию государственной самостоятельности ВКЛ.<br>Не была утверждёна сеймом литовским и так и не вступила в силу. |
| **1569** | **Люблинская уния**<br>Государственный союз между Королевством Польским и Великим княжеством Литовским.<br>Утверждена депутатами на общем сейме и Сигизмундом II Августом (последним Ягеллоном).<br>Образование Речи Посполитой — федеративного объединения под властью одного выборного короля.<br>При этом и ВКЛ, и Польша сохраняли свои собственные административный аппарат, казну, войско и законы. |
| *Одним из следствий уний является то, что в Беларусь (в отличие от России) абсолютная монархия пришла только в XIX веке* | |

# Крыху першакрыніц

- Мапы ВКЛ XIII-XVIII ст
  старыя геаграфічныя мапы нашай краіны
- Літва, лакалізацыя тэрміна па мапах і летапісах
- Страчная спадчына XV-XVIII ст
  графічнае адраджэньне зруйнаваных сьвятынь
- Статут ВКЛ 1529, 1566, 1588 асноўны закон ВКЛ
- Метрыкі Літоўскія XV-XVIII ст
  збор дакумантаў канцэлярыі ВКЛ
- Перапіс войска Літоўскага 1528-1565
  імянныя сьпісы, знаёмыя прозвішча
- "Беларусы ў фотаздымках" І. Сербаў 1911
  Традыцыйныя строі і мястэчкавыя цэрквы
- "Описание всех народов России" 1799
  першае зводнае апісаньне ад Імператарскай АН
- "Живописная Россия" А. Г. Киркор, 1882
  Т. 3, ч.1 и ч. 2 “Литовское и Белорусское Полесье”
- "Россия. Полное географическое описание." 1905
  Т.9 “Верхнее Поднепровье и Белоруссия”
- Хроніка Быхаўца XV-XVI ст.
- Хроніка Литоўская і Жмойтская XVII ст
- "К истории тайных обществ и кружков" 1824
  Філаматы і філарэты — матэрыялы следства і спіс удзельнікаў
- "Славянские древности" П. Й. Шафарик, 1847
  этнаграфічнае апісаньне Эўропы X-XII ст.
- "Белорусская шляхта и панцирные бояре" 1905
  доўгі тэкст ад Імператарскай АН, фотаздымкі, успаміны
- "Chronicon terrae Prussiae" Peter von Duisburg, 1326
  хроніка вайны ВКЛ з Тэўтонскім Ордэнам (арыгінал / пераклад)
- Спіс гарадоў Свідрыгайла 1432
  спіс гарадоў, падтрымаўшых князя ў Грамадзянскай вайне
- "Kronika Polska" Marcin Bielski, 1597
  геральдыка ваяводстваў Рэчы Паспалітай
- "Die Deutschen und die Nachbarstamme" Й. К. Цейсс, 1837
  "Немцы і суседзі", класічныя цытаты аб яцьвягах, люцічах, літвінах
- Дубніцкая хроніка XIV-XV ст.
  клятва Кейстута — першыя ўзгадкі старабеларускай мовы
- "Atlas Historyczny" A. le Sage, 1844
  пекная табліца гербаў ваяводстваў Рэчы Паспалітай
- Канстытуцыяя 3 мая 1791 года
  спроба выратаваць краіну ад анархіі "liberum veto"

# Зьмесьціва

Прадмова 1

Рода-племянныя хаўрусы V-VIII ст. 2

Полацкае княства IX-XIII ст. 4

- Рагвалод, Рагнеда, Ізяслаў. Рагваложы ўнукі 5
- Росквіт і заняпад 6
- Турава-Пінскае княства 7
- Рэлігія часоў Полацкага княства 7

Вялікае княства Літоўскае да Крэўскай уніі 1236-1385 9

- Палітычны стан XIII ст. 9
- Літва Міндаўга 1236-1269 9
- Віцень, Воін і Гедымін 1293-1341 11
- Альгерд и Кейстут 1345-1377 13
- Ягайла і Вітаўт 1377-1430. 14
- Крэўская унія 1385 15

ВКЛ ад Крэўскай да Люблінскай уніі 1385-1569 17

- Свідрыгайла і Грамадзянская вайна 1432-1438 17
- Вялікія князі-Ягелоны 1440-1572 18
- Войны 1487-1537, акрэсьліўшыя ўсходнюю мяжу РБ 19
- Спіс войска Літоўскага 1528 20
- Статут Літоўскі 1529 21
- Лівонская вайна 1558-1583 21
- Люблінская унія 1569 22

Рэч Паспалітая 1569-1795 23

- Акт Варшаўскай канфедерацыі 1573 23
- Генрыкавы артыкулы 1573 і абраныя каралі 1574 24
- Берасьцейская царкоўная унія 1596 25
- Вайна за Эстляндыю 1600-1611 26
- Вайна за Маскву 1609-1618 і ўзяцьце Крамля 27
- Крывавы Патоп 1654-1677 28
- Грамадзянская вайна 1696-1702 30

- Вялікая Паўночная вайна 1700-1721 — 30
- Шляхецкія канфедэрацыі 1715-1792 — 31
- Канстытуцыя 3 мая 1791 — 32
- Падзелы Рэчы Паспалітай 1772, 1792, 1795 — 33

Паўночна-Заходні край 1795-1918 35

- Вайна Напалеона з Расеяй 1812-1814 — 36
- Таварыства філаматаў і філарэтаў 1817-1823 — 36
- Паўстаньне 1830 — 37
- Паўстаньне 1863 Каліноўскага — 39

Беларусь 1918-1991 40

- Першая Сусветная вайна 1914 — 40
- Беларуская Народная Рэспубліка (БНР) 1918 — 41
- БССР у складзе СССР 1919-1991 — 42
- Рэспубліка Беларусь 1991 — 43

**Дадатковыя матэрыялы**

- Мапы “беларускага племені” (1875, 1903, 1919) — 44
- Вялікія князі ВКЛ (ад Міндаўга да Панятоўскага) — 45
- Ваяводствы Літвы, Русі і Жмудзі (1864 г.) — 46
- Уніі ВКЛ-Польшча (ад Крэўскай да Люблінскай) — 47
- Спіс літаратуры — 48